В систему высшего и послевузовского образования многих стран включают специальные дисциплины, кафедры, секторы, занимающиеся исследованиями старинной музыки и вопросами сохранения культуры инструментального исполнительства. Наличие исследовательских процессов в области инструментоведения и создание учебных программ в структуре высшего образования поможет выйти на международный уровень коммуникации между научно-исследовательскими центрами.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. *Мальдис, Адам.* Полоцкая тетрадь? Нет. Остромечевская рукопись? Да! / Адам Мальдис // Советская Белоруссия. – 2012. – 20 июля (№ 133). – С. 10–11.

2. *Немцева, О. А.* История развития профессионального образования в сфере народно-инструментального искусства / О. А. Немцева // Культура. Наука. Творчество : XVI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12 мая 2022 г. : сб. науч. ст. – М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2022. – С. 237–241.

УДК [688.792.3:745.5](476) “19”

**В. І. Трубач,**
*магістр мастацтвазнаўства, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# КАРЦІНКІ НА ШКЛЕ ЯК АДЗІН СА СКЛАДНІКАЎ ВЯСКОВАГА ІНТЭР’ЕРА

**Анатацыя.** *Карцінкі на шкле былі шырока прадстаўлены ў беларускіх вясковых інтэр’ерах у 1950–1960 гг., аднак да гэтага часу не сталіся прадметам асобнага даследавання. Яны з’явіліся ў канцы XIX – пачатку XX ст., напачатку выступалі ў ролі хатніх абразоў. Выяўлена мастацкая прырода карцінак на шкле і стылістычныя адрозненні выканання твораў. Павялічаны спіс твораў малапашыранага сакральнага жывапісу.*

**Ключавыя словы:** *роспіс на шкле, карцінкі на шкле, інсітнае мастацтва, кіч, інтэр’ер, сімулякр, рамка, іканапіс на шкле.*

**V. Trubach,**
*Master of Arts, Junior Researcher of the Department of Folklore and Culture of the Slavic Peoples of the State National University "Centre for the Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Republic of Belarus*

# PICTURES ON GLASS AS ONE OF THE COMPONENTS OF VILLAGE INTERIOR

**Abstract.** *Pictures on glass were widely represented in Belarusian rural interiors in the 1950s and 1960s. 20th century, but until now they have not become the subject of a separate study. They appeared at the end of the 19th – beginning of the 20th century and initially acted as household icons. The article shows the artistic nature of the pictures on the glass and the stylistic differences in the execution of the works. An expanded list of works of little widespread sacred painting.*

**Key words:** *painting on glass, pictures on glass, intuitive art, kitsch, interior, simulacrum, frame, icon painting on glass.*

У канцы XIX ст. перад нашымі продкамі, падчас змены «курных» хат на «чыстыя» (з комінам), паўстала пытанне аздаблення інтэр’ера свайго жылля. Тады і набыў пашырэнне роспіс на шкле як від упрыгожвання сялянскай хаты. Менавіта шкло з’яўлялася асновай для мастацкага роспісу так званых малюнкаў, карцінак. На шкле малявалі і абразы (іконы), якія з’явіліся ў Беларусі гістарычна раней, чым карцінкі.

Звычайна гэтыя арыгінальныя творы з выявамі коцікаў, галубоў і паненак можна было набыць на кірмашах або ў вандроўных гандляроў, якія ездзілі па вёсках і прадавалі гэтыя карцінкі. Тэхніка роспісу характарызавалася аператыўнасцю і прастатой выканання, таму часта сустракаліся копіі пашыраных сюжэтаў. Пераважна іх рабілі рамеснікі і толькі зрэдку аўтарам мастацкага роспісу аказваўся мясцовы мастак. Трэба адзначыць, што малюнкі на шкле, як і маляваныя дываны, выступалі ў ролі попытавых тавараў масавага арт-рынку, які актыўна пачаў працаваць пасля Другой сусветнай вайны. Гэта было звязана з патрэбай пасляваеннай вёскі аздабляць, упрыгожваць, надаваць гармонію і раўнавагу свайму жытлу. Тым самым насельніцтва спрабавала кампенсаваць жахі перажытых ліхалеццяў.

Складанасць вывучэння дадзенага віду мастацкай творчасці звязана з часам пералому эпох (пачатак XX ст.), калі, з аднаго боку, адбываўся працэс падзелу мастацтва на класічнае, народнае, элітарнае, масавае і г. д., а з другога – узнікненне сінкрэтычных, кампрамісных формаў мастацтва, якія карысталіся попытам у насельніцтва. Да іх можна аднесці і карцінкі на шкле.

З цягам часу пачало адбывацца паступовае пераасэнсаванне гэтай з’явы.

У беларускім мастацтвазнаўстве першымі да тэмы народнага роспісу на шкле звярнуліся В. А. Говар і Я. М. Сахута. У 1983 г. яны публікуюць артыкул «Народны роспіс па шкле» [1]. У 1994 г. у зборніку матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі «Примитив в изобразительном искусстве» выйшаў артыкул В. А. Лабачэўскай «Расписные стекла – между примитивом и кичем» [3]. У 1997 г. Я. М. Сахута піша працу «Народнае мастацтва Беларусі». У ёй маецца артыкул «Роспіс па тканіне і шкле» [5]. У 2003 г. з’явіўся навуковы артыкул Р. Шауры «Дэкаратыўны роспіс на шкле» [8]. У 2005 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для навучэнцаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» выдадзена кніга Н. Пачынавай «Белорусская народная декоративная роспись» [4]. Варта адзначыць артыкулы Г. А. Флікоп «Абразы “на шкле” і “за шклом”» [6] і «Иконопис на склі в Белоруссии: витоки ремесла, творчества 1920–1930-х гг. в музейных коллекциях и частных коллекциях» [7]. Апошняя публікацыя па тэме даследавання ўбачыла свет у 2020 г. Гэта артыкул В. Лабачэўскай «Народныя карцінкі на шкле ў Беларусі: да пытання мастацкай вартасці і тыпалогіі» [2].

Паралельна з навуковым асэнсаваннем мастацкага роспісу на шкле адбывалася і музеефікацыя малюнкаў на шкле. Так, у 2010 г. Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту была зладжана выстава выяў мастацкага роспісу на шкле. Аснову экспазіцыі склалі малюнкі на шкле са збораў музея. Праз год выйшаў каталог гэтых твораў, які ўключае ў сябе 45 прац. У 2012 г. вышэйназваная выстава разам з калекцыяй маляваных дываноў экспанавалася ў Нацыянальным мастацкім музеі пад агульнай назвай «Кветкі раю».

Шаснаццаць узораў роспісу на шкле, сабраных у межах Вілейскага раёна, налічвае калекцыя Вілейскага краязнаўчага музея. У 2013 г. у названым музеі адбылася выстава «Маляваны рай», дзе экспанаваліся маляваныя дываны, куфры, прадметы ткацтва і малюнкі на шкле. У тым жа годзе выстава паказвалася ў Мінску ў гарадской мастацкай галерэі Л. Шчамялёва пад назвай «З Вілейкі з любоўю». Уласную калекцыю карцінак на шкле мае гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе».

У беларускім мастацтвазнаўстве тэма роспісаў на шкле распрацавана ў кантэксце агульнай тыпалогіі і ўніверсальных характарыстык гэтай з’явы, больш дакладна разгледжаны малапашыраныя прыклады твораў сакральнага жывапісу. У той жа час, апошняя выстава, прысвечаная народнаму мастацкаму роспісу на шкле як асобнаму віду народнай творчасці, адбылася ў 2010 г. у Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту.

Тым не менш, нягледзячы на пэўную ступень даследавання дадзенай тэмы, народны мастацкі роспіс на шкле ў ролі асобнага прадмета комплекснага даследавання да сённяшняга часу не выступаў: не вызначаны

гістарычныя прычыны з’яўлення на тэрыторыі Беларусі, не дадзены разгорнутая тыпалагічная і вобразная характарыстыкі малюнкаў на шкле, не абазначана месца ў народным інтэр’еры, няма спецыфікацыі праяў кіча і інсітнага мастацтва ў роспісе на шкле. Гэтым і абумоўлена неабходнасць дадзенага даследавання, *мэтай* якога з’яўляецца вызначэнне мастацкіх асаблівасцей народнага роспісу на шкле пачатку – сярэдзіны ХХ ст. і месца дадзенай з’явы ў вясковым інтэр’еры.

*Роспіс на шкле ў народным інтэр’еры*

Тэхніка мастацкага роспісу на шкле бярэ свой пачатак з гатычнага стылю, яна звязана з пачаткам упрыгожвання роспісамі аконных шыбаў храмаў. З XV ст. шкло ператварылася ў зручны для роспісу матэрыял, і на яго пачалі капіраваць творы знакамітых мастакоў, маляваць персанажаў майстроў Адраджэння, міфалагічных персанажаў і арабескі. З XVIII ст. роспіс на шкле стаў распаўсюджвацца ў Заходняй Еўропе і найбольшае пашырэнне атрымаў у другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. З XVIII ст. у тэхніцы роспісу на шкле пачалі вырабляць абразы або карцінкі рэлігійнага зместу. Так, у Трансільваніі (Румынія), Славакіі, Чэхіі, Сілезіі, Украіне існавалі цэнтры сакральнага роспісу на шкле. У Беларусі такіх цэнтраў не было. Іконы на шкле малявалі асобныя мастакі, імёны якіх засталіся невядомымі. Чаго не скажаш пра свецкія карцінкі на шкле, аўтары якіх часта былі вядомы. Свецкі мастацкі роспіс на шкле быў найбольш папулярны ў 1950–1960 гг.

У адрозненне ад замежнага роспісу на шкле, у якім пераважаў іканапіс, у Беларусі быў пашыраны свецкі характар роспісу. Гэта было абумоўлена антырэлігійнай палітыкай СССР, у склад якой уваходзіла наша краіна. Шкляныя абразы пераважна адносяцца да наступных іканаграфічных зводаў: выявы Багародзіцы тыпу Адзігітрыі, Ісуса Хрыста тыпу Пантакратара, адзіночныя іконы Багародзіцы, а таксама біблейскія сюжэты. Самая старажытная ікона на шкле хатняга тыпу ікона «Багародзіца з дзіцём» знаходзіцца ў фондах Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі. Яна паходзіць з хутара Дарагляны Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці і датуецца канцом ХІХ – пачаткам ХХ ст.

Імёны аўтараў малюнкаў на шкле пераважна невядомыя. Аднак навукоўцы высветлілі наступныя прозвішчы майстроў родам з Заходняга Палесся: А. Васілеўская (в. Здзітава, Бярозаўскі раён), В. Жуковіч (в. Спорава, Бярозаўскі раён), В. Юрашэвіч (в. Крамно, Драгічынскі раён), Л. Доўгер (в. Агова, Іванаўскі раён). Мы знайшлі імёны новых аўтараў: І. Мысліцкі (в. Сейлавічы, Нясвіжскі раён), В. Калінін (в. Дубіца, Брэсцкі раён).

Дэкаратыўныя роспісы на шкле з’яўляюцца важным складнікам цэласнага ансамбля сельскага жылля нароўні з вышыванымі ручнікамі і ўзорыстымі тканымі посцілкамі. Малюнкі на шкле з дыванамі садзейнічалі ператварэнню сялянскай хаты з памяшкання гаспадарчага характару ва ўласна жылое збудаванне, з адмысловым інтэр’ерам.

Імітацыйная прырода малюнкаў на шкле складаецца ў тым, што яны ствараюць ілюзію класічнай станковай карціны, якая выступае ў якасці прэстыжнага прадмета мастацтва, як сведчанне высокага сацыяльнага статусу яго ўладальніка. Адпаведна вяскоўцу было прасцей стаць уладальнікам сімулякра – сурагатнага замenніка твора высокага мастацтва і прадметаў ужытку, чым сапраўднага дывана, карціны або якаснай рэпрадукцыі.

*Тыпалогія і стылістыка выканання карцінак на шкле*

Намі была зроблена спроба ажыццявіць падрабязную тыпалогію малюнкаў на шкле, заснаваную на падзеле, які прапанавала В. Лабачэўская [2, с. 133]. Па прызначэнні малюнкі на шкле падзяляюцца на абразы, інтэр'ерныя карцінкі розных жанраў і карцінкі-рамкі для фатаграфій і абразкоў.

Найбольш пашыраным тыпам малюнкаў на шкле з'яўляюцца інтэр'ерныя карцінкі. Па жанравай прыналежнасці іх можна падзяліць на антрапаморфныя, зааморфныя, фларыстычныя, казачныя сюжэты і пейзажы.

Антрапаморфныя карцінкі галоўным чынам прадстаўлены жаночымі вобразамі, якія часам адлюстраваны як падвоеныя партрэты. Галубы, паўліны, лебедзі, каты або намінальна птушкі – гэта тое, што прадстаўлена зааморфным жанрам. Фларыстычныя карцінкі – букеты ў кошыках, вазах або асобныя кветкі.

Сярод роспісаў на шкле сюжэты з казак прадстаўлены рэдка. Сустракаюцца выявы па матывах твораў В. Васняцова: «Тры асілкі», «Іван-царэвіч і шэры воўк». Пейзажы – таксама малапашыраная катэгорыя малюнкаў на шкле. Пры тым сюжэты пейзажаў часта адлюстроўваюць вясковыя замалёўкі.

Асобным тыпам вылучаюцца рамкі да фотаздымкаў і абразоў. Патрэбу ў афармленні маленькіх паліграфічных абразоў (часцей за ўсё каталіцкай традыцыі) таксама задавальнялі рамкі. Апошнія ўяўлялі сабой дэкаратыўны роспіс, які быў прадстаўлены часцей за ўсё элементамі расліннага арнаменту, букетамі кветак або нацюрмортамі, радзей – зааморфнымі матывамі. Рамкі маглі змяшчаць ад аднаго да дзясятка здымкаў, якія ўстаўляліся з адваротнага боку ў незамаляваныя акенцы. Звычайна абразок у рамцы быў адным экзэмплярам.

Кампазіцыйнае вырашэнне малюнкаў на шкле складаецца з буйнога выяўленчага матыву (або групы) цэнтральнага поля, які зроблены на каляровым або фольгавым фоне.

Пашыраныя фігуратыўныя кампазіцыі, часта акаймаваныя выявамі дэкаратыўных кветак. На іх пераважна намаляваны зааморфныя матывы: галубы, каты, конікі. Існуюць і шматфігурныя кампазіцыі. Гэтыя прыклады прадстаўлены біблейскімі або казачнымі сцэнамі. Часам кампазіцыя вырашана дэкаратыўнымі гірляндамі кветак, якія акружаюць фотаздымак або невялічкі абразок.

Звернем увагу на факт таго, што гатовыя ўзоры карцінак на шкле служылі асновай для тыражавання як самімі вытворцамі, так і іншымі, часам у разы менш здольнымі мастакамі. Апошнія займаліся такой дзейнасцю ў першую чаргу ў камерцыйных мэтах.

Трэба адзначыць, што некаторыя малюнкі на шкле паўтараюць сюжэты вышытых карцінак або, як кажуць у народзе, «рамак».

Стылістычна малюнкі на шкле падзяляюцца на дзве плыні: творы аўтарскага, інсітнага характару і кіч. Да першай адносяцца аўтарскія выявы, якім характэрна індывідуальная манера выканання, арыгінальная, інсітная творчасць. Апошняй уласціва самастойная перапрацоўка і інтэрпрэтацыя першапачатковых сюжэтаў і ўзораў. Другая плынь – кічавы напрамак, уніфікацыя па кампазіцыі, капійны характар выканання. Гэта група была найбольш пашырана сярод малюнкаў на шкле, іх аўтары засталіся невядомымі. У роспісе на шкле можна сцвярджаць толькі пра тэндэнцыі або элементы аўтарскага бачання, праявы інсітнага мастацтва. У рамках дадзенага даследавання да такіх аўтараў аднясём А. Васілеўскую, І. Мысліцкага і В. Калініна.

*Вобразная характарыстыка малюнкаў на шкле*

Вобразную тэматыку беларускага мастацкага роспісу на шкле можна падзяліць на сакральную і свецкую плыні.

Даследчыца Г. Флікоп-Світа на аснове матэрыялаў з архіўных крыніц выявіла, што найбольш раннія перыяды распаўсюджання абразоў на шкле ў межах сучаснай тэрыторыі Беларусі датуюцца другой паловай XVIII – пачаткам XIX ст. Абразы паходзяць з уніяцкіх храмаў розных рэгіёнаў краіны: Слонімшчыны, Рагачоўшчыны, Пастаўшчыны, Зельвеншчыны, Навагрудчыны і інш. [7].

Г. Флікоп-Світа выдзяляе пэўныя фактары, якія аказалі непасрэдны ўплыў на ўзнікненне сакральнага роспісу на шкле ў Беларусі. Першы – гэта адносна танны кошт аконнага шкла і адпаведных лакаў і фарбаў. Другі – уваходжанне Заходняй Беларусі ў перыяд 1920–1930-х гг. у склад Польшчы.

Падчас збору матэрыялу для напісання даследавання намі быў знойдзены твор, які патрабуе асобнага разгляду. Каталіцкі абраз «Пан Езус з Росі цудамі вядомы» паходзіць з в. Дзіневічы Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці. Абраз знаходзіцца ва ўласнасці Ю. Дзяргаўкі, да якога абраз перайшоў у спадчыну ад бабулі Соф'і Парманчук. Абраз зроблены ў тэхніцы роспісу на шкле. Са слоў уласніка, яна датуецца пачаткам XX ст. Аўтар невядомы (мал.).




*Мал.* «Пан Езус з Росі цудамі вядомы»
в. Дзіневічы, Бераставіцкі раён

Памер абраза, улічваючы драўляную раму, – 23х17 см. На ім намаляваная выява Ісуса Хрыста. Ісус сядзіць, над яго апушчанай галавой – цярновы вянок. Каля ног Ісуса – надпіс па-польску: «Jezu zmilujsie nad nami. P. Jezuz w Rosi Cudami Slynacy». У перакладзе на беларускую мову – «Езус, змілуйся над намі. Пан Езус з Росі, цудамі вядомы».

Выява Ісуса на гродзенскай іконе на шкле мае адпаведны прататып у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Рось Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. Там знаходзіцца драўляная фігура Езуса Засмучанага (Журботнага).

Паводле «Народнага мастацтва Польшчы», такая ж ікона на шкле «Пан Езус з Росі цудамі вядомы» была знойдзена на Беласточчыне, паблізу Сямятычаў [9, с. 160]. Адрозненні маюцца толькі ў фонавым колеры рэльефнай паперы іконы: на польскім абразе ён залаты. «Абразок уяўляе цудадзейную фігуру з касцёла з Росі каля Ваўкавыска, сённяшняя Беларусь. У XIX ст. жыхары Падлясся, напэўна, выпраўляліся да яе ў пілігрымку і там набывалі абразок» – такое тлумачэнне падаецца ў вышэйзгаданай кнізе [9, с. 160].

У нашай калекцыі фотаздымкаў ікон на шкле ёсць ікона з вызначаным аўтарствам: «Маці Божая Іерусалімская», намаляваная А. Васілеўскай з в. Здзітава Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў 1950–1960-х гг. Яна спісаная з узору друкаваных абразоў, зацверджаных Святым Сінодам – вышэйшым органам царкоўна-дзяржаўнага кіравання Рускай царквой у перыяд з 1721–1917 гг. Трэба адзначыць, што пераносіць выяву з літаграфіі на шкло маглі некалькімі шляхамі: калі літаграфія задавальняла памерамі, то яе непасрэдна падкладалі пад шкло і перамалёўвалі, калі літаграфія была большых памераў, то рабілі накід на паперы і пасля пераносілі на ікону. І трэці шлях – адвольна выконвалі контуры ад рукі.

Намі была знойдзена літаграфія «Маці Божая Іерусалімская», якая і стала прататыпам для стварэння здзітаўскай іконы на шкле. Яна з’яўляецца сямейнай іконай і знаходзіцца ў в. Хаўсты Смаргонскага раёна Мінскай вобласці. Калі параўнаць шкляную ікону і друкаваны ўзор, то можна пабачыць, што першы мае люстэркавае адлюстраванне. Гэта тыповая сітуацыя для копій. А. Васілеўская дэталёва перадае сюжэт і дадае сваю стылістыку, якая праяўляецца ў адмысловай сіне-карычневай гаме выявы, дэкаратыўна аздобленым, чырвоным мафорыі Багародзіцы. Аўтар імкнецца паказаць цені ад зморшчын на адзенні Багародзіцы з дзіцём. Сімвалічна, што за асноўны колер іконы выбраны сіні, які адпавядае колеру тунікі Багародзіцы і нагадвае пра яе нябесную і дасканалую чысціню. На наш погляд, у дадзенай іконе праяўляецца аўтарская інтэрпрэтацыя першапачатковага ўзору.

Варта звярнуць увагу на дэкаратыўна аздобленыя шкляныя рамкі пад абразкі. Яны ўяўлялі надрукаваныя зменшаныя абразы святых: «Багародзіца Адзігітрыя», «Укрыжаванне Ісуса Хрыста», «Багародзіца з Пасау», «Ісус Хрыстос», «Мікалай Цудатворац». Часцей за ўсё папяровыя абразкі належаць да каталіцкай іканаграфіі. Рамкі – карцінкі, размаляваныя раслінна-кветкавымі матывамі, па цэнтры якіх знаходзяцца незамаляваныя акенцы. У іх з адваротнага боку шкла ўстаўлены іконкі. Звычайна ў якасці фону для такіх рамак выкарыстоўвалі фольгу.

Па крытэрыі размяшчэння стылізаваных кветкавых кампазіцый адносна цэнтральнага абразка мы ўмоўна падзялілі рамкі на тры групы: рапортныя, паўвянцовыя, колавыя.

Букетныя кампазіцыі з’яўляюцца папулярным вобразам у роспісе на шкле. З сабранай намі калекцыі чорны фон букетных кампазіцый у вялікай колькасці прадстаўленыя экспанатамі гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе».

Асобнага разгляду патрабуюць жаночыя партрэтныя вобразы. Сустракаюцца выявы жанчын разам з жывёламі: коцікамі, лебедзямі, галубамі або ўніверсальнай птушкай – і амаль заўсёды ў атачэнні кветак.

Паненкі на карцінках звязаны з паштоўкамі і фотакарткамі з закаханымі парачкамі, кветкамі і галубамі, якія былі папулярныя і пашыраныя

ў 1940–1960-я гг. у гарадах і вёсках СССР. «Жанчыны», якія пасяліліся ў пасляваенным інтэр'еры, нібыта прыйшлі з іншага жыцця, дзе пануе раскоша і ўтульнасць.

Часта жаночыя вобразы дапаўняліся галаўнымі ўборамі – капелюшамі з шырокімі палямі, бантамі або завязкамі. Правобразамі такіх убораў сталі еўрапейскія дамскія капелюшы другой паловы XIX ст.

Яшчэ адным пашыраным вобразам для стварэння малюнкаў на шкле з'яўляюцца папулярныя творы класічнага рускага жывапісу, у прыватнасці В. Васняцова. У нашай калекцыі маюцца малюнкі на шкле па матывах «Трох асілкаў» і «Івана-царэвіча і шэрага воўка», створаныя ў 1950-х гг. Абодва захоўваюцца ў фондах Вілейскага краязнаўчага музея і паходзяць з в. Рабунь Вілейскага раёна.

Вобразы зааморфнага паходжання шырока прадстаўленыя ў народным мастацкім роспісе на шкле, птушкі і прадстаўнікі каціных – найбольш папулярныя персанажы. У сістэме міфапаэтычных вераванняў вобразы птушак і звяроў наўпрост звязаныя з практыкай татэмізму.

Такім чынам, росквіт малюнкаў на шкле ў сярэдзіне XX ст. абумоўлены грамадска-эканамічнымі ўмовамі: распад традыцыйных эканамічных сувязей, развіццё таварна-грашовых адносін, разбурэнне традыцыйнага ладу жыцця, паступовая ўрбанізацыя вёскі і наступствы Другой сусветнай вайны. Беларускі народны мастацкі роспіс на шкле характарызуецца свецкай накіраванасцю; большасць малюнкаў на шкле з'яўляюцца інтэр'ернымі карцінкамі з буйным выяўленчым матывам цэнтральнага поля і ў асноўным прадстаўлены фларыстычнымі вобразамі. Існуе стылістычны падзел твораў народнага мастацкага роспісу на шкле на інсітную і кічавую плыні: выявы аўтарскага характару, якія прадстаўляюць індывідуальную манеру выканання і другі напрамак, які характарызуецца капійным характарам выканання. Малюнкі на шкле ўяўляюць сабой форму мастацкіх сімулякраў – сурагатных заменнікаў твораў высокага мастацтва.

Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаныя ў навукова-даследчай, экспазіцыйна-выставачнай, метадычнай, педагагічнай і асветніцкай працы. Могуць быць карыснымі пры падрыхтоўцы спецыялізаваных навуковых выданняў, каталогаў, манаграфій і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па гісторыі беларускага мастацтва і культуры XX ст. Яны будуць карыснымі ў сферы турызму, прамысловасці і рэкламы.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Говар, В. А.* Народны роспіс па шкле / В. А. Говар, Я. М. Сахута // Помнікі гісторыі і культуры. – 1983. – № 4. – С. 31–33.

2. *Лабачэўская, В. А.* Народныя карцінкі на шкле ў Беларусі: да пытання мастацкай вартасці і тыпалогіі / В. А. Лабачэўская // Традыцыі

і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. – Мінск, 2020. – С. 133–137.

3. *Лобачевская, О. А.* Расписные стекла – между примитивом и кичем / О. А. Лобачевская // Примитив в изобразительном искусстве : материалы Всероссийской науч.-практ. конф. – М., 1994. – С. 47–54.

4. *Починова, Н. В.* Белорусская народная декоративная роспись / Н. В. Починова. – Минск : Выш. шк., 2005. – 174 с.

5. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1997. – 287 с.

6. *Флікоп, Г. А.* Абразы «на шкле» і «за шклом» у грэка-каталіцкіх храмах Беларусі ў XVIII–XIX стагоддзях / Г. А. Флікоп // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 25–26 крас., 2013 г. : у 5 ч. – Мінск, 2013. – С. 200–205.

7. *Фликоп-Свита, Г. А.* Иконопис на склі в Белоруссии: витоки ремесла, творчества 1920–1930-х рр. в музейных коллекциях и частных коллекциях / Г. А. Фликоп-Світа // Народознавчи зошити. – 2018 г. – № 2 (140). – С. 514–522.

8. *Шаура, Р. Ф.* Дэкаратыўны роспіс на шкле / Р. Ф. Шаура // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф. – М., 2003. – С. 235–241.

9. *Mironiuk-Nikolska, A.* Polska sztuka luowa // A. Mironiuk-Nikolska. – Sport I Turystyka. Muza SA. – Warszawa, 2010. – С. 160–161.

УДК [612.392.74:398]:165.212(476.7)

**У. В. Фалітарык,**
*магістр арт-менеджменту, загадчык метадычнага аддзела дзяржаўнай установы культуры «Іванаўскі раённы Цэнтр культуры і народных традыцый», г. Іванава, Рэспубліка Беларусь*

# СІМВОЛІКА ХЛЕБА Ў ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

**Анатацыя.** *Артыкул змяшчае асноўныя аспекты светапогляду заходніх палешукоў, звязанага з сімвалам хлеба, звяртаецца ўвага на яго выкарыстанне ў абрадавай культуры. Адрасуецца культуролагам і ўсім цікаўным людзям, якія займаюцца захаваннем этнакультурнай спадчыны.*

**Ключавыя словы:** *хлеб, сімвал, Заходняе Палессе, этнакультурная спадчына, абрадавая культура.*